Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (100), 2017

*УДК821.161.3-1*

# Жанравая спецыфіка сучаснай беларускай жаночай паэзіі

М.І. Кірушкіна

Разглядаюцца лірычныя жанры на прыкладзе сучаснай беларускай жаночай паэзіі. Лірычныя тэксты маюць не толькі своеасаблівую прадметную тэматыку, але і характарызуюцца адметнымі мастацкімі асаблівасцямі паэтычнай формы. У сучаснай беларускай жаночай паэзіі тыпалогія лірычных жанраў прадстаўлена «вершанятамі» Галіны Каржанеўскай, «марскімі шпількамі» Ганны Ціханавай, «вершалініямі» Насты Кудасавай, «рысасловамі» Людкі Сільновай. Устойлівыя суадносіны зместу, інтуіцыі аўтара, рэфлексіі чытача складаюць жанравую структуру тэкстаў. Творчасць сучасных паэтак мала вывучана, што абумоўлівае навізну працы.
**Ключавыя словы:** жаночая паэзія, творчая самаідэнтыфікацыя, архітэктоніка літаратурнага твора, мастацкія асаблівасці паэтычнай формы, тыпалогія лірычных жанраў, «жаночая прырода» тэксту.

Lyrical genres on the example of modern Belarusian women's poetry are considered. The lyrical texts have the subject matter, and they are also characterized by distinctive artistic features of poetic form. In modern Belarusian women’s poetry the typology of lyrical genres is presented by «short rhymes» of Galina Korzhanevskaya, by «sea steeples» of Anna Tikhonova, by «poetic lines» of Anastasia Kudasova, by «line-words» of Lyudmila Silnova. The stable correlation of the content, the author’s intuition and the reader’s reflection constitute the genre structure of texts. Creativity of contemporary poetesses is little studied, resulting in the novelty of this work.
**Keywords:** feminine poetry, creative self-identification, architecture of a literary work, artistic features of poetic form, typology of lyrical genres, «feminine nature» of the text.

У сучаснай беларускай паэзіі папулярнай з’яўляецца тэндэнцыя адносна лірычнага выказвання аўтарскага «я» ў паэтычнай мініяцюрнай форме. Міні-вершы характарызуюцца найбольшай ступенню рэалізацыі суб’ектыўнага пачатку і магчымасцю паэтычнага эксперыменту. Сінкрэтызм розных стылістычных прыёмаў з улікам аўтарскіх эмацыйных кампанентаў, якія рэалізуюцца ў мініяцюрнай паэтычнай форме, фармальна можна вызначыць як жанр. Напрыклад, некаторая «лагічная рэакцыя» на сацыяльна-творчы кантэкст у мастацтве, а таксама глыбокі аўтарскі падтэкст прадстаўлены ў чатырохрадкоўі Р. Баравіковай «Нюансы»:

І дзякуй Богу, што не ўсе!
Але той-сёй мастак вялізны.
Так спраўна піша, бы трасе
ў падтэксце брудную бялізну [1, с. 33].

У даволі невялікай паэтычнай форме паэтка выказвае асабістыя эмацыйныя адчуванні. Паэтычная прастора тэксту ў такой мастацкай форме толькі спрыяе з’яўленню множнасці асацыяцый рэцыпіента.

Адкрыты пошук новых ідэйна-эстэтычных узроўняў, злучэнне розных асацыяцый, слоў як графічных носьбітаў эмоцый і паэтычных вобразаў у кантэксце адной мастацкай формы акцэнтуюць увагу на пераацэнцы традыцыйных прынцыпаў і пашырэнні тэндэнцыі жанравых навацый у паэзіі.

У тэорыі літаратуры жанр як тып мастацкага твора мае адметнасці, якія аб’ядноўваюць усе творы па адпаведных крытэрыях:

– вызначаная тэма;
– адносіны аўтара;
– эстэтычныя ўласцівасці жыццёвага матэрыялу, што знаходзяцца ў аснове тэмы твора;
– патрабаванні ўстойлівай традыцыі развіцця і прытрымліваннем яе [2].

«Паэтычная гульня» з лаканічнай формай мастацкага тэксту спрыяе выяўленню глыбокага сэнсу, які адлюстроўвае спецыфіку сучасных лірычных жанраў.

Увага нашага даследавання канцэнтруецца на вершаваных формах лірыкі, а менавіта, на сучасных лірычных тэкстах, аўтарам якіх з’яўляецца жанчына.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

У сучаснай беларускай жаночай паэзіі тыпалогія лірычных жанраў прадстаўлена вершанятамі Г. Каржанеўскай, «марскімі шпількамі» Г. Ціханавай, «вершалініямі» Н. Кудасавай, «рысасловамі» Л. Сільновай і інш. Устойлівыя суадносіны зместу, аўтарскай інтуіцыі і рэфлексіі чытача характарызуюць жанравую структуру гэтых вершатэкстаў. Пры гэтым неабходна ўлічваць мастацкі стыль лірычнага тэксту, які складаюць розныя элементы – аўтарская ідэя, вобразная эстэтыка і верагодная эмацыянальная рэакцыя чытача.

Згодна з А. Есіным [3], мастацкая форма ўяўляе сабой не набор або кангламерат асобных прыёмаў, а змястоўна абумоўленую цэласнасць; яе адлюстраваннем і з'яўляецца катэгорыя стылю. Спасылаючыся на стыль, усе элементы формы падпарадкоўваюцца адзінай мастацкай заканамернасці, выяўляюць наяўнасць дамінантнага прынцыпу. Ён як бы праймае структуру формы, вызначаючы характар і функцыі любога яе элемента.

Стылістычныя прынцыпы, якія ўплываюць на жанравыя формы ў сучаснай беларускай жаночай паэзіі, наступныя:

– адлюстраванне асабістай светапогляднай сістэмы аўтара ў жанравай структуры паэтычнага тэксту;

– мастацкая рэалізацыя паняцця маргінальнасці, якое спрыяе з'яўленню «новага жанру» і такім чынам актуалізуе аўтарскі эксперымент. У сучаснай жаночай паэзіі маргінальныя паэтычныя формы – гэта арыгінальныя мініяцюрныя тэксты, у якіх паэткі з мэтай стварэння адпаведнага паэтычнага зместу выкарыстоўваюць прынцып мастацкай мадыфікацыі. Такім чынам, аўтаркі ўдзельнічаюць у працэсе абнаўлення не толькі паэтыкі, але і сістэмы лірычных жанраў.

Н. Кудасава, рэалізуючы свой асабісты творчы вопыт, акцэнтуе ўвагу на жанравай спецыфіцы лірычных тэкстаў ужо ў адным з вершаў: «вершалінаў вершалініі – // сознаў роспачнае sos – // я самотаю птушынаю // чую рытмаў вашых рост. // Як жукамі-караедамі // словы пад карай свярбяць <...>» [4, с. 3]. Творчы пошук і эксперымент спрыяюць таму, што вершы паэткі ўяўляюць сабой «лірычнае злучэнне» пэўных сэнсавых і сінтаксічных перыядаў, у якіх думкі аўтара рэалізуюцца лінейна, а ў апошніх паэтычных радках верша змяшчаецца філасофскі вывад. Філасофскія развагі Н. Кудасавай паэтапна прадстаўлены ў наступным лірычным тэксце:

ілбом
выпіваю сцяну
нагбом
мокражылле цягну
з нутра
беспрытульны калос [4, с. 14].

Формай адлюстравання філасофска-эстэтычнага погляду з'яўляюцца словы: «пара // распранацца да слёз» [4, с. 14]. Своеасаблівы «паэтычны рэцэпт» у арганізацыі лагічных сувязяў паміж вершаванымі радкамі адносна жанравай характарыстыкі тэксту можна назваць «вершалініямі».

Такім чынам, «вершалініі» Н. Кудасавай – гэта лірычныя нерыфмаваныя тэксты з паслядоўным паэтычным выкладаннем думак аўтара, дзе кожны радок у вершы з'яўляецца лагічным працягам наступнага.

У сучаснай беларускай жаночай паэзіі папулярнымі з'яўляюцца маргінальныя лірычныя жанры. У слоўніку І. Ільіна [5] паняцце маргінальнасці мае наступнае значэнне: перыферыйнасць якой-небудзь з'явы сацыяльнай жыццядзейнасці чалавека ў адносінах да дамінуючай тэндэнцыі свайго часу або агульнапрынятай філасофскай, этычнай традыцыі. У адносінах да жанравых асаблівасцей літаратурнага тэксту гэта паэтычныя формы, якія ўзнікаюць на мяжы розных эстэтычных сістэм і займаюць перыферыйную пазіцыю адносна традыцыйных жанраў.

Маргінальным жанрам з'яўляюцца паэтычныя мініяцюры «рысасловы» Л. Сільновай з аднайменнага зборніка [6]. «Тэксты» паэткі ўяўляюць сабой сінтэтычныя аднаслоўныя «кампаненты» выяўлення мастацкай думкі. У «рысасловах» злучаюцца паэзія і мастацкае мастацтва (графіка): у паэтычным слове для выражэння пэўнага сэнсу некаторыя з літар замяняюцца графічным малюнкам. Ключом для «расшыфроўкі» значэння таго ці іншага «тэксту» служаць асацыяцыі чытача. Напрыклад, у «рысаслове» «Космас» [6, с. 14] для стварэння мастацкага вобраза тэксту замест літары «о» паэткай прадстаўлены сімвалічны

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

малюнак у выглядзе каметы з зоркамі. Візуальная паэзія Л. Сільновай, якая ўключае аднаслоўныя паэтычныя тэксты, – гэта свайго роду эксперыментальныя жанравыя формы, у якіх галоўная роля адносна сэнсавай нагрузкі мастацкага твора адводзіцца сімваліцы літар.

У сучаснай жаночай паэзіі ў якасці маргінальнага жанру можна разгледзець «марскія шпількі» Г. Ціханавай. Двухрадковыя, максімальна лаканічныя вершы паэткі – гэта жанравыя формы, якія ствараюцца пасродкам сінтэзу паэзіі і лінгвістыкі (лексікалогіі). Сэнс вершаваных радкоў выяўляецца аўтарам пры выкарыстанні ў паэтычных тэкстах фанетычных амонімаў:

Я апынулася Ў бездані.
Я акунулася Ў БЭЗ ... Здані ... [7, с. 27].

У вышэйпрыведзенай паэтычнай мініяцюры амафоны «бездані / БЭЗ ... Здані» ствараюць эфект рытмічна арганізаванага і рыфмаванага тэксту.

Выкарыстанне паэткай падобных лексічных адзінак дазваляе чытачу па-рознаму інтэрпрэтаваць сэнс паэтычных мініяцюр. У наступным лірычным тэксце, які прадугледжвае адказ на пытанне, таксама можа захоўвацца пэўнае суб’ектыўнае значэнне:

Скончыўся вечар цікава ...
Скончыўся вечар ... ці кава? [7, с. 27].

«Марскія шпількі» Г. Ціханавай – гэта лаканічныя вершы з дакладна строгай камбінацыяй як слоў, так і гукаў у словах.

Сыходзячы з прынятага пастулата, што «жаночая літаратура» – гэта тэксты, напісаныя аўтарам-жанчынам, катэгорыя гендару пры аналізе тых або іншых мастацкіх асаблівасцей можа рэалізавацца і ў структуры літаратурных жанраў.

У шырокім вымярэнні паняцце «гендар» закранае сацыяльныя, культурныя, псіхалагічныя асаблівасці асобы, якія адпаведна рэалізуюцца ва ўсіх канцэптуальных вымярэннях. «Метафара культуры» мае свае адметнасці і ў літаратурных тэкстах. Сучасным літаратуразнаўствам даследуецца гендарная ідэнтычнасць як усведамленне суб’ектам (аўтарам, героем, лірычным суб’ектам / героям) сваёй прыналежнасці да культурных азначэнняў «мужчынскага» і «жаночага». Зафіксаваныя ў культурна-сацыяльным асяроддзі адпаведныя стэрэатыпы вызначаюцца паводле літаратуразнаўчага аналізу мастацкіх тэкстаў: падлягаюць даследаванню парадыгма мастацкіх вобразаў і матываў, мастацка-філасофская сімволіка сюжэта адносна гендарнага дыскурса. Разглядаецца цэласная карціна ўсяго твора адносна мастацкіх асаблівасцей літаратурнага рода. Паводле В. Цюпы, маецца на ўвазе «быццё» тэксту: «сэнс, які набывае сваю актуальнасць толькі пры сустрэчы з іншым сэнсам (у свядомасці іншай асобы) – тэкст, які ажыццяўляе знакавую (рэчыўную) маніфестацыю гэтага сэнсу для свядомасці, што валодае ўспрыманнем» [8, с. 24]. Таму сэнсавая архітэктоніка літаратурнага твора як аб’екта эстэтычнага ўспрыняцця ў спалучэнні з іншай рэальнасцю (дыскурсіўнай прэзентацыяй зместу) можа набываць адценні іншай эмацыянальнай рэакцыі чытача на змест тэксту.

У рэчышчы разумення жанру як своеасаблівай дамоўленасці паміж аўтарам і рэцыпіентам, можна казаць пра тое, што ў яго структуры знаходзяцца паняцці фемінінасці (жаночага) або маскуліннасці (мужчынскага). В. Цюпа адзначае, што «дыскурс жанру – гэта сістэма камунікатыўных кампетэнцый: крэатыўнай (суб’ектна-аўтарскай), рэферэнтнай (аб’ектна-геройнай) і рэцэптыўнай (адрасна-чытацкай)» [9, с. 34]. Галоўным значэннем для гендарнага дыскурсу жанру з’яўляецца як яго адрасацыя, так і лексіка-семантычная афарбоўка, што і вызначае аўтарскую стратэгію і прадметна-зместавае напаўненне.

Вызначаючы асаблівасці дадзеных лірычных твораў як любога мастацкага тэксту, трэба ўлічваць азначэнне (у слоўніку постмадэрнісцкіх тэрмінаў), што пад тэкстам маецца на ўвазе семантычны і фармальны аспект любога твора мастацтва, які павінен быць успрыняты і «прачытаны» рэцыпіентам. З мэтай такога «прачытання» Р. Барт, тэарэтык постструктуралізму, вылучыў паняцце «код» – гэта акрэсленыя тыпы ўжо бачанага, ужо прачытанага, ужо таго, што зроблена. Натуральна, вельмі важным азначэннем валодае жанравы код Д. Фоккема. Гэта код, які актывізуе ў рэцыпіента вызначыныя ўжо «чаканні», звязаныя з выбраным жанрам аўтара для тэксту [5].

РЭПОЗІТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Паспрабуем прааналізаваць жанравыя адметнасці вершанят Г. Каржанеўскай. Вершаваныя мініяцюры паэткі – гэта кароткія рыфмаваныя паводле лірычнай формы тэксты з глыбокім сэнсавым адценнем. Жанравая азначэнне «вершаняты» з пазіцыі рэцыпіента арыентуе на ўспрыняццё пяшчотна-эмацыянальнага зместу твора. Да прыкладу:

Не ўсё ў жыцці
і радасна, і гладка
Спакусы,
перашкоды,
міражы...
Але гарыць нябесная лампадка
Ў жывой неабыякавай душы [10, с. 10].

Падобная лаканічная форма з'яўляецца адным са спосабаў перадачы сэнсу тэксту, які фарміруецца на ўзроўні аўтарскіх інтэнцый. Суб'ектыўнасць аўтара-жанчыны вызначаецца праз рэфлексію-да сябе, якая набывае адзнакі рэфлексіі для ўсіх. У наступнай мініяцюры аўтар выражае свае ўласныя адчуванні:

Надакучыла быць слабою,
Надакучыла быць
з табою.
І колькі б нясмеласць ні мучала,
Саступаць усім
надакучыла! [10, с. 22].

Г. Каржанеўская адлюстроўвае жаночае ўспрыманне быцця, якое складаецца з асабістых пачуццяў і аўтаматычна «пераносіцца» на жанр «вершаняты». Гэта паэтычныя «жаночныя» тэксты, што складаюцца з пэўных сугестыўных знакаў жаночай суб'ектыўнасці. Жанравы код мініяцюр паэткі вызначаецца наступным чынам: верш (лірычная форма) + пачуццёва-ласкальны аналіз рэчаіснасці (паэтычны змест) = вершаняты.

У выніку, фемінны характар жаночых тэкстаў можа ўплываць не толькі на змест і вобразна-сімвалічную сістэму, але і падкрэсліваць жанравыя адметнасці твора.

Такім чынам, на жанравае вызначэнне лірычных формаў, прадстаўленых у паэзіі аўтарамі-жанчынамі, уплываюць як асабісты творчы патэнцыял аўтара, так і тэндэнцыя да перыферыйнасці адносна архітэктонікі і вобразнасці міні-тэкстаў.

## Літаратура

1. Баравікова, Р. Люстэрка для самотнай : Вершы, пераклады і драматычная паэма / Р. Баравікова. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1992. – 206 с.

2. Борев, Ю. Теория литературы : в 4-х т. / Ю. Борев, Н. Гей, С. Бочаров, А. Михайлов. – Москва : ИМЛИ РАН, 2003. – Т. 3: Роды и жанры (основные проблемы в историческом освещении). – 592 с.

3. Есин, А. Стиль / А. Есин // Введение в литературоведение: Учеб. Пособие ; под ред. Л. Чернец. – Мінск : Высш. шк., 2004. – С. 488–498.

4. Кудасава, Н. Маё невымаўля : вершы / Н. Кудасава. – Мінск : Кнігазбор, 2016. – 116 с.

5. Ильин, И. Постмодернизм : словарь терминов / И. Ильин. – Мінск : ИНИОН РАН – INTRADA, 2001. – 384 с.

6. Сільнова, Л. Рысасловы / Л. Сільнова. – Полацк : Полац. ляда, 1994. – 35 с.

7. Ціханава, Г. Марскія шпількі / Г. Ціханава // Другое полушарие / Another hemisphere. – 2013. – № 21. – С. 27.

8. Тюпа, В. Аналитика художественного (Введение в литературоведческий анализ) / В. Тюпа. – Москва : Лабиринт, РГГУ, 2001. – 192 с.

9. Тюпа, В. Жанр и дискурс / В. Тюпа // Критика и семиотика. – 2011. – Вып. 15. – С. 31–42.

10. Каржанеўская, Г. Вершаняты. Паэтычныя мініяцюры / Г. Каржанеўская / Мінск : «Беллітфонд», 2005. – 120 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 22.03.2016

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ